■ Працаўладкаванне

# АБ'ЕКТ ПАТРАБУЕ КАДРАЎ

## На «кірмашы вакансій» у Гродне многія выбіралі работу на будаўніцтве атамнай электрастанцыі

**Самым буйным наймальнікам стала прадпрыемства «Белэнергабуд», філіял якога ўзводзіць Беларускую АЭС. Будаўніцтва пашыраецца, і цяпер сюды патрэбны каля 200 рабочых: муляраў, бетоншчыкаў, мантажнікаў, тынкоўшчыкаў, зваршчыкаў. Начальнік аддзела кадраў галаўнога прадпрыемства Наталля КУЛАК пабывала ўжо ў дзесяці рэгіёнах краіны і лічыць, што гродзенская кампанія — адна з найбольш паспяховых. За некалькі гадзін прыёму звярнулася больш за 30 чалавек.**



Фота Віталя ДЗЯРНЕЙКІ.

Гродзенец Дзмітрый расказаў, што ўжо працаваў на будаўніцтве атамнай электрастанцыі ад расійскай арганізацыі, але наймальнікі пакінулі яго без зарплаты. Цяпер ён хоча ўладкавацца на беларускім прадпрыемстве бетоншчыкам. Гэта магчыма, але пасля таго, як Дзмітрый пройдзе перападрыхтоўку.

— У нас шмат рабочых, якія маюць стаж работы бетоншчыкам і арматуршчыкам, але не маюць адпаведнай кваліфікацыі. Раней гэта не патрабавалася, таму па гэтых дзвюх спецыяльнасцях у нас наладжана перападрыхтоўка, — кажа Наталля Кулак. — Зараз без кваліфікацыі мы наогул нікога не бяром.

Прыём дакументаў не азначае, што саіскальніка ўзялі на работу. Кожны кандыдат павінен прайсці спецыяльную праверку па лініі дзяржбяспекі. Ігар, які мае 12 гадоў стажу зваршчыкам, не адразу прызнаўся, што яго звольнілі за парушэнне працоўнай дысцыпліны. Пры вынясенні канчатковага рашэння, камісія, вядома, будзе ўлічваць гэты факт, — зазначыла Наталля Кулак.



Усяго на «кірмаш вакансій» прыйшлі 250 чалавек. У асноўным мужчыны, бо сустрэча была арганізавана для прадстаўнікоў будаўнічага профілю. Акрамя гродзенскіх наймальнікаў, прысутнічалі прадстаўнікі Брэста, Пінска, Мінска.

— Свае кадры шукалі ў нас 14 наймальнікаў, але самая вялікая чарга ўтварылася да прадпрыемства атамшчыкаў. Некаторых кандыдатаў адзначалі на перспектыву, бо на АЭС работа вядзецца вахтавым метадам, і варта стварыць рэзерв кадраў, — растлумачыла **намеснік начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага гарвыканкама Аксана ФЛЁРКА.**

Яна паведаміла, што ў Цэнтры занятасці тэматычныя кірмашы вакансій сталі традыцыйнымі. Да гэтага мэтавыя аўдыторыі збіралі наймальнікі з прамысловых прадпрыемстваў, сферы гандлю, аховы здароўя, адукацыі.

— З пачатку года 140 грodзенцаў атрымалі новую кваліфікацыю, што дае ім магчымасць канкураваць на рынку працы, — зазначыла Аксана Флёрка. — Некаторыя атрымліваюць некалькі сумежных прафесій, напрыклад тынкоўшчык-маляр-абліцоўшчык. Бывае, што чалавек доўгі час працаваў, напрыклад, прадаўцом, але дакументаў, якія гэта пацвярджаюць, не мае. Пасля вучобы рынак працы значна пашыраецца.

Некаторыя беспрацоўныя скарысталіся магчымасцю атрымаць сродкі на ўласную справу. Летась у Гродне было выдадзена 73 субсідыі, за тры месяцы гэтага года яшчэ 19. Многія адкрываюць прыватныя майстэрні, займаюцца рамяством, прадаюць сувенірнай прадукцыі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

❍ **У тэму:**

*На 1 красавіка ў Гродзенскім гарадскім цэнтры занятасці зарэгістравана амаль 2 тысячы беспрацоўных, з якіх 75% складаюць мужчыны, пераважна рабочых прафесій. Вакансій горад можа прапанаваць крыху больш за паўтары тысячы. Значную іх частку складаюць сферы адукацыі, аховы здароўя, гандлю.*

# УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ. ГАЛАСЫ СЯБРОЎ...

**У «Мастацкай літаратуры» працягваецца выданне Збору твораў Уладзіміра Караткевіча ў 25 тамах. Пабачыў том перакладаў і аўтаперакладаў — пятнаццаты па ліку. Падрыхтаваў тэксты, зрабіў каментары, напісаў прадмову літаратуразнаўца Анатоль Верабей.**

Адкрываецца кніга вершам Расула Гамзатава. «Дзяцінства бачу, што прайшло даўно, / З усмешкай і слязінкаю на веях. / І колькі ты ні кліч яго, / яно / Не прыйдзе зноў, днём веснім не павее. / І старасць бачу, што трымае меч. / Маўчу прад ёй з журботай і трывогай. / І нават калі я ёй крыкну: «Прэч!» — / Сівая не сыдзе з маёй дарогі».

Як галасы сяброў гучаць па-беларуску ў пераўвасабленні Уладзіміра Караткевіча вершы Байрана і Махтумкулі, Эраніма Стулпана і Яна Гушчы, Уладзіслава Бранеўскага і Альбінаса Жукаўскаса...



**Алег Лойка, яго жонка Лідзія, Уладзімір Караткевіч, Вячка Целеш, Мірдза Абала. Дом творчасці ў Дубултах (Латвія), ліпень 1981 года.**

Вельмі шмат перакладаў Уладзімір Караткевіч украінцаў. Гэта і зразумела: універсітэцкую адукацыю атрымаў у Кіеве, добра валодаў украінскай мовай, з вялікай прыязнасцю ставіўся да гісторыі Украіны. З украінскай наш беларускі класік пераклаў вершы Івана Гнацюка, Міколы Зграва, Сцяпана Ліцвіна, Уладзіміра Лучука, Маі Львовіч, Аксаны Сенатовіч, Васіля Чумака. У творах сяброў, цікавых яму паэтаў старэйшых пакаленняў Уладзімір Караткевіч адшукваў і беларускія матывы. Таму і гучалі па-беларуску «Хатынь» чэха Карала Цвейна, «Рэфлексія пра Кастуся» і «Сосны ў Гродні» Аксаны Сенатовіч, «Падалі бомбы на вуліцы Менска...» і «На Волзе, у Ніжнім, змалку ўзрос сабе...» Маі Львовіч, «Прыпутні на Прыпяці» Уладзіміра Лучука, «Над сіняю затокаю надзеі» Івана Гнацюка. Шырокія далягляды паўстаюць з тома перакладаў Уладзіміра Караткевіча. Тыя далягляды, што дазваляюць нам, беларусам, выбудоўваць трывалыя масты дружбы з блізкімі суседзямі, з усім светам.

Калісьці — у 1993 годзе — пераклады У. Караткевіча былі надрукаваны асобнай кнігай: «Галасы маіх сяброў» — у серыі «Кніга аднаго перакладчыка». Цяпер, на шчасце, у дапоўненым выглядзе, з улікам і празаічных перакладаў, — у Зборы твораў. Пятнаццаты том У. Караткевіча нагадаў і пра колішнюю серыю «Мастацкай літаратуры», і пра тое, што ў новых зборніках такога фармату маглі б успомніць аб вялікіх майстрах мастацкага перакладу, пашырыць сённяшнюю атмасферу ўвагі да перакладчыцкай работы. Важна, канешне ж, каб быў у такіх кніг і чытач — свой, беларускі, здольны адчуць усю асалоду, усю крынічнасць беларускіх перакazaў лепшых узораў мастацкай літаратуры свету.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

■ Падрабязнасці

# Умацаваць «лёгкія» планеты

## Міністры ўнутраных спраў і лясной гаспадаркі разам высадзілі дрэвы

**Ігар Шуневіч і Міхаіл Амельяновіч прынялі ўдзел у традыцыйнай добраахвотнай акцыі «Тыдзень лесу», якая ў Беларусі праводзіцца ўжо дзясяты раз. Сёлета яна прысвечана ліквідацыі наступстваў разгулу стыхіі ў мінулым ліпені. Свой асабісты ўклад у аднаўленне лясоў кіраўнікі двух ведамстваў унеслі на тэрыторыі Драчкоўскага лясніцтва ў Смалявіцкім раёне, дзе высадзілі маладыя дубкі і клёны.**

— Міліцэйскае ведамства ўдзяляе асаблівую ўвагу захаванню прыродных рэсурсаў Беларусі. У гэтым пытанні мы шчыльна супрацоўнічаем з міністэрствамі лясной гаспадаркі, сельскай гаспадаркі і харчавання, Дзяржаўнай інспекцыяй аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце, — адзначыў **міністр унутраных спраў Ігар ШУНЕВІЧ.** — Сённяшняе мерапрыемства атрымалася вельмі душэўным. Наш лес, прыродныя багацці — гэта здабытак, які неабходна памнажаць.

Нароўні з кіраўніком міліцэйскага ведамства да акцыі далучыліся намеснік міністра ўнутраных спраў па ідэалагічнай рабоце і кадраваму забеспячэнні Аляксандр Кобрусеў, начальнік УУС Мінскай вобласці Ігар Яўсееў, а таксама курсанты Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў МУС. У сваю чаргу, **міністр лясной гаспадаркі Міхаіл АМЕЛЬЯНОВІЧ** падзякаваў прысутным за дапамогу і выказаў надзею, што вынікі агульнай працы будуць заўважныя і праз стагоддзе.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Гучная справа

# На «Івацэвічдрэве» — буйныя страты

**Камітэт дзяржаўнай бяспекі спыніў карупцыйную дзейнасць генеральнага дырэктара ААТ «Івацэвічдрэў» Уладзіміра Шульгі, які арганізаваў пастаўку імпартнай сыравіны па завышаным кошце праз падкантрольныя замежныя кампаніі.**

Як паведамляе прэс-служба КДБ Беларусі, для вытворчага працэсу прадпрыемства набывае імпартны меламін. З 2014 года асноўнымі пастаўшчыкамі гэтай сыравіны былі «National Resources L.P.» (Літва) і «Great Imports/exports L.P.» (Шатландыя), фактычнымі ўладальнікамі якіх з'яўляўся ў тым ліку сын кіраўніка «Івацэвічдрэва». Праз гэтыя фірмы меламін закупляўся ў кітайскіх вытворцаў па цане каля 800 долараў за тону, а пасля рэалізаваўся «Івацэвічдрэву» па цане каля 1400 еўра за тону. Прадпрыемства ў выніку пазбавілася больш чым 200 тысяч еўра. У дачыненні да фігурантаў заведзена крымінальная справа. Усе знаходзяцца пад вартай.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Здарэнне

# Сам сябе выдаў

**Звычка садзіцца за руль у неадэкватным стане давяла 21-гадовага бабруйчаніна да крымінальнай адказнасці.**

Не паспела скончыцца дзеянне адміністрацыйнага пакарання за адмову праходжання агляду на прадмет вызначэння стану алкагольнага ап'янення, як малады чалавек зноў сеў за руль, гэтым разам пад уздзеяннем наркатычных і псіхатропных сродкаў. З хуткасцю 50 кіламетраў у гадзіну ён рухаўся па вуліцы Мінскай у Бабруйску за «Фіятам», які ехаў наперадзе. Адлегласць паміж машынамі была такая маленькая, што, калі інспектар ДАІ загадаў кіроўцу «Фіята» прыпыніцца і выйшаў на дарогу, парушальнік, каб не сутыкнуцца з аўтамабілем, зрабіў рэзкі паварот направа і наехаў на інспектара. Супрацоўнік дарожна-патрульнай службы атрымаў цяжкія цялесныя пашкоджанні. Маладому чалавеку прад'яўлена абвінавачанне па артыкуле 317, частках 1 і 4 КК. Закон прадугледжвае ў якасці пакарання да 7 гадоў пазбаўлення волі, а таксама пазбаўленне права садзіцца за руль на тэрмін да 5 гадоў, паведаміў **начальнік аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці Уладзімір ДРОБАЎ.** Кропку ў гэтай справе паставіць суд.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

| ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | | |
| Продавец | ООО «БЕЛИНВЕСТ-инжиниринг», г. Минск, пл. Свободы, 17/2 | | | |
| Предмет аукциона | | | | |
| Лот №1 | | | | |
| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
| **Административное помещение** | Административное помещение | 333,7 кв. м | 500/D-708175052 | г. Минск, пр-т Победителей, 119-506 |
| Начальная цена с НДС 20% | **448 660,10 белорусского рубля (BYN)** | | | |
| Лот №2 | | | | |
| **Административное помещение** | Административное помещение | 345,2 кв. м | 500/D-708175055 | г. Минск, пр-т Победителей, 119-510 |
| Начальная цена с НДС 20% | **460 378,80 белорусского рубля (BYN)** | | | |
| **Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | | | | |
| Срок подписания договора купли-продажи | **10** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| Условия оплаты предмета аукциона | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | | | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в г. «Звязда» в номере от 02.03.2017 | | | | |
| Дата и время проведения аукциона | **04.05.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| Дата и время окончания приема документов | **02.05.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| Контактные телефоны | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** | | | |

КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» уведомляет, что в информацию о повторном открытом аукционе по продаже имущества УПУП «Гродненская областная автошкола» **26 апреля 2017 года** внесены изменения: столбец 2 строки 2 следует читать в следующей редакции: начальная цена – **42 000 рублей (с учетом НДС 20%)**